

У 1994 годзе ў Оршы быў створаны музей «Нашы знакамітыя землякі», адзін з раздзелаў экспазіцыі якога планавалася прысвяціць У. Караткевічу. Але ў 1995 годзе паступіла прапанова ад Саюза пісьменнікаў Беларусі аб стварэнні ў Оршы менавіта музея пісьменніка. І ўжо ў верасні 1997 года музею знакамітых землякоў была дадзена назва «Аршанскі музей У. С. Караткевіча». У 2000 годзе да 70-годдзя з дня яго нараджэння быў адчынены будынак музея з невялікай экспазіцыяй толькі ў адным зале. А з лютага 2002 года музей гасцінна расчыніў дзверы для сваіх наведвальнікаў.









Уладзімір Караткевіч

***Бібліятэка ім. Д.Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі***



# ***«Майстар гістарычнага рамана»***

## ***( 95-год з дня нараджэння пісьменніка, публіцыста, драматурга, сцэнарыста Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча)***
## ***1930-1984***

***Горкі, 2025***

# БІЯГРАФІЯ ПАЭТА

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч — беларускі паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, сцэнарыст, класік беларускай літаратуры. Першы беларускі пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву.



Нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў Оршы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі з сям’ёй у Пермскай вобласці, пазней у Арэнбурзе. У 1954-м г. скончыў філалагічны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта. Пасля гэтага працаваў настаўнікам у сельскай школе ў Кіеўскай вобласці, а затым у родным горадзе. Пазней вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах (1960) і ў інстытуце кінематаграфіі ў Маскве, стаў прафесійным пісьменнікам.





У 1958 г. быў выдадзены першы зборнік паэзіі «Матчына душа», пасля ім былі падрыхтаваны да друку яшчэ тры аўтарскія паэтычныя зборнікі: «Вячэрнія ветразі», «Мая Іліяда», «Быў. Ёсць. Буду».










У 1961 г. выйшаў першы зборнік прозы «Блакіт і золата дня», ў які ўвайшлі аповесці «Сівая легенда», «Цыганскі кароль» і апавяданні. За ім рушылі ўслед зборнікі «Чазенія» і «Вока тайфуна» — першая кніжная Публікацыя аповесцяў «Лісце каштанаў» і «Дзікае паляванне караля Стаха».










Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей, «З вякоў мінулых», раманаў «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», аповесці «У снягах драмае вясна» і інш. Для дзяцей выдаў «Казкі» і нарыс «Белавежская пушча».










Напісаў таксама некалькі п’ес, сцэнарыяў для мастацкіх фільмаў, вялікую колькасць эсэ, нарысаў і артыкулаў.

Асабліва варта адзначыць кнігу «Зямля пад белымі крыламі», прысвечаную прыродзе і гісторыі Беларусі, якая распавядае пра традыцыі і звычаі беларускага народа.




Напісаў сцэнарыі кароткаметражных фільмаў «Сведкі вечнасці», «Памяць каменя», «Будзь шчаслівай, рака», сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (першапачатковая назва «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка»), «Чырвоны агат», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі». На тэлебачанні і радыё па яго творах пастаўлены шэраг спектакляў.